# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і  кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.

У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2022 год з’яўляецца юбілейным.

# 90 гадоў

**Чорны, К. Бацькаўшчына / К. Чорны. – Мінск : ЛіМ ДВБ, 1932. – 156 с.**

Адзін з найлепшых твораў Кузьмы Чорнага (сапраўднае імя – Мікалай Карлавіч Раманоўскі, 1900–1944).

Кніга друкавалася ў Мінску ў друкарні імя Сталіна (сёння РУП «Выдавецтва Беларускі дом друку»). Здадзена ў набор 20.03.1932 г., а падпісана да друку 16.06.1932 г.

Выданне выйшла ў цвёрдым пераплёце без ілюстрацый.

Тыраж – 3000 экзэмпляраў.



# 90 гадоў

У рамане «Бацькаўшчына» адлюстраваны змены ў жыцці грамадства, што адбываліся ў пачатку XX стагоддзя. Галоўны герой – сын ткача-паўстанца з Сілезіі селянін Леапольд Гушка. Усё сваё жыццё ён вымушаны служыць парабкам у пана, залежаць ад яго. Леапольд марыць аб «дзвюх дзесяцінах», каб «па-чалавечы пажыць», «ні на чыю ласку не апірацца». З мэтай здабыць грошы на першы зямельны надзел Леапольд прадае ўсё да апошняй міскі з хаты… І трапляе ў кабалу да кулака Сурвілы. Толькі пасля рэвалюцыі Леапольд здзейсніў мару. Ён атрымаў некалькі дзесяцін камяністай няўдобіцы і пачаў працаваць на ёй як закляты. Але час змяніўся, і герой твора становіцца змагаром за новы лад. Ён аддае ў камуну свой надзел зямлі. На апошніх старонках рамана Леапольд паўстае як старшыня калгаса, кіраўнік пасяджэння раённага з’езда Саветаў.

Як адзначаюць сучасныя крытыкі, логіка развіцця характару Леапольда відавочна парушаецца. І з сённяшняга пункту гледжання такія паводзіны здзіўляюць, здаюцца нелагічнымі і невытлумачальнымі. Гэтым учынкам герой твора як бы перакрэслівае сваю ранейшую жыццёвую праграму.

# 90 гадоў

«Чорнаму хацелася паказаць, як пакутаваў чалавек, кладучы свае сілы на чужой зямлі, як карчаваў няўробленую дзялянку дзірваністага поля, колькі ў ім сілы духу і прагі жыць па-людску, як ён адразу акрыяў, ледзь адкрылася перад ім магчымасць стаць цвёрда на свае ногі і быць гападаром на зямлі.
Хацелася пісьменніку паказаць і тое, як паступова пазбаўляўся яго герой ад многіх прымхлівых забабонаў, у якія ён працяглы час верыў, як скідваў з сябе путы былых уяўленняў і марных спадзяванняў і як станавіўся свядомым удзельнікам вялікіх рэвалюцыйных падзей».

М. Тычына

# 90 гадоў

Перш чым выйсці асобным выданнем, твор «Бацькаўшчына» друкаваўся часткамі ў літаратурна-мастацкім часопісе «Узвышша» ў нумарах 4–9 за 1931 год.






ЗЬМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| **Кузьма Чорны**—Бацькаўшчына (*аповесьць*) | 3 |
| **Максім Лужанін**—Маладосьць (*вершы*) | 33 |
| **З. Бядуля**—Язэп Крушынскі (*роман*) | 47 |
| **В. Казлоўскі**—Будуецца мост (*вершы*) | 81 |
| **С. Русаковіч**—Крумкач (*апавяданьне*) | 88 |
| **З. Астапенка**—Пад знакам сонца (*вершы*) | 100 |
| **Х. Дунец**—Нататкі пра яўрэйскую літаратуру | 105 |
| **А. Цітоў**—Агляд творчасьці Я. Скрыгана | 112 |


Галоўлітбел № 1164. Зак. № 1603. У ліку 1500 экз. Гомель, друкарня „Палесдрук"



Кузьма Чорны

## Бацькаўшчына

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

### I. Леапольд Гушка

Каб ўявіць, колькі працы павінен быў тут класьці чалавек, трэба самому ўбачыць гэтую дзялянку. І камяніца, і глей. Камяніца—наверсе. Там каржакаваты хвойнічак, як і запамятаюць людзі, усё гэтакі-ж самы, росту яму няма. Некаторыя хвоі аж на ралы пабіліся, вяршаліна часта віламі ўбок пашла. Тут камяніца скрозь. Гэта—узгорак над балотам, над асакою, над сіўцом у лагу. Пакуль з узгорку ў балота, яшчэ як на злосьць тую, нібыта й мурог у вочы кінецца, а падыдзеш бліжэй, дык там адзін сівец, нібыта што й добрае. Калі мінуць хвойнічак, ідучы ў гару праз яго, дык праз чвэртку кілёмэтра разьбяжыцца поле і шлях. Тут трапіш усё-адно як у якую-небудзь іншую краіну: поле ўрадлівае, глею, каменьня — нізваньня. Шлях — гасьцінец. Старасьвецкія бярозавыя прысады загінаюцца ўправа, а адтуль ужо спрадвеку патыхала панскім духам: глухенькае места, панскае і шляхэчае гняздо. Места—так, мае вуліц з трыццаць; невялічкі гарадок. Стаўшы на ўзгорку, з краю каржакаватага хвойнічку, відаць: чорная вежа сярэднявяковага княжага замку, шэрая касьцельная вежа, зялёная царкоўная, рудая (абшарпаная бляха) былога бэрнардынскага кляштару. Гэты кляштар, пасьля паўстаньня шэсьцьдзесят трэцяга году, расійская імпэрская ўлада скасавала. Там толькі ў аднэй двухпавярховай мураванай афіцыне, што ў глыбі двара, жылі два ці тры ксяндзы і іхнія пакаёўкі, даволі такі дзябёлыя і ў самай жаночай моцы кабеціны. Калі з ветрам, дык тут у хвойнічку нават чуваць, як вызвоньваюцца гадзіны на замкавай вежы, або як звоняць на мшу ў касьцёле ці ў царкве. Гукі гэтыя за дзесяць кілёмэтраў даходзяць сюды добра. Я-ж кажу, места гэтае тут відаць добра, яно стаіць на даволі такі вялікім узгорку.

Поле па той бок хвойнічку роўнае, добрае; калі ў каго ёсьць каму як і чым урабіць яго, ды калі яшчэ яго ёсьць колькі трэба, дык яно табе ў сто столак верне. Але бяда была, што траха ня ўвесь гэты абшар—панскі. Сяляне абселіся на гэты бок хвойнічку. Тут таксама не сказаць, каб зямля была занадта кепская, толькі што падроблена яна на мышыныя загончыкі: народ размножваўся, без дзяльбы, калі ў каго й было поля ўмеру, як тут маглі жыць! Спрадвеку людзі дзяліліся. Але большая гаворка ў гэтай аповесьці будзе не пра гэта.

# 90 гадоў

Па матывах рамана «Бацькаўшчына» Кузьма Чорны напісаў аднаіменную п’есу, якая была пастаўлена рэжысёрам Львом Літвінавым 7 лістапада 1932 г. на сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы) і атрымала шмат добрых водгукаў і рэцэнзій.



*Ролю галоўнага героя Леапольда Гушкі ў спектаклі выконваў Уладзімір Уладамірскі.*



*Ролю Мазавецкага ў спектаклі выконваў Генрых Грыгоніс.*

*Прачытаць раман Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына» можна на сайце беларускай электроннай бібліятэкі «Беларуская палічка»:* [https://knihi.com/Kuzma_Corny/Backauscyna_scan.html](https://knihi.com/Kuzma_Corny/Backauscyna_scan.html) .

*А на гэтай старонцы бібліятэкі можна пазнаёміцца з аналізам рамана «Бацькаўшчына», зробленым Іванам Мележам:* [https://knihi.com/Ivan_Mielez/Pra_tvorcasc_Kuzmy_Cornaha.html](https://knihi.com/Ivan_Mielez/Pra_tvorcasc_Kuzmy_Cornaha.html).

2022 год

ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ